## *Да 95-годдзя Міколы Ермаловіча*



У сучаснасці кожнага чалавека існуе пэўнае, для каго большае, для каго меншае кола асобаў, дзякуючы дзейнасці якіх можна ганарыцца сваёй сучаснасцю. Але вельмі шкада, што не ўсе сёння могуць назваць сябе сучаснікамі Міколы Ермаловіча, пры тым што з’яўляюцца сучаснікамі яго сучаснікаў. Па-добраму, вельмі светла зайздросціш тады людзям, якія бачылі яго, схіленага над пісьмовым сталом, над першакрыніцай, разглядаючы яе праз акуляры і пад павелічальным шклом. Зайздросціш тым, хто мог паслухаць яго, пагаварыць з ім, задаць яму пытанні і атрымаць адказы. Але часопісу «Маладосць» пашчасціла друкаваць яго «Старажытную Беларусь», і кожны «маладосцевец» праз гэтую акалічнасць з’яўляецца-такі сучаснікам Міколы Ермаловіча. Бо і ён нам сучаснік. Хіба можна паверыць, што вось гэты верш напісаны ім сорак гадоў таму?

**Гэта пры нас...**

Гэта пры нас Беларусь забівалі,
Гэта пры нас ёй магілу капалі,
Ды аб ратунку яе мы не дбалі,
Мы яе ворагу самі аддалі.
Многія з нас нават катамі сталі,
Разам з прыблудамі білі, тапталі,
Гналі яе, ёй у вочы плявалі.
Мы ж гэта шчасцем яе называлі,
Будучнасць слаўную ёй прадракалі
І пераможныя гімны складалі.
Гэта пры нас Беларусь забівалі.
Гэта пры нас ёй магілу капалі,
Толькі адны мы у гэтым віноўны,
Толькі адным нам і мераю поўнай
Вечнай агіды адмерана будзе,
Бо не падставілі мы свае грудзі,
Каб засланіць імі маці Радзіму.
Гэта бо толькі і ёсць тым адзіным,
Чым здабываюць жыццё і свабоду,
Гонар і славу Айчыне й народу.
Гэта пры нас Беларусь забівалі,
Гэта пры нас ёй магілу капалі.

1976